# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

2 лістапада 2016 г.
№ 18 (381)


КАПЕЙКА ДА КАПЕЙКІ

## ЖЫЦЬ УЛАСНЫМІ ДАХОДАМІ

***Як недатацыйныя раёны плануюць свой бюджэт***

Надзея АНІСОВІЧ

**Пераважная большасць раёнаў нашай краіны з'яўляюцца датацыйнымі. Рэдкасць, калі бюджэт тэрытарыяльнай адзінкі збалансаваны і людзі там жывуць па сродках. У 2017 годзе з рэспубліканскага бюджэту будзе выдзелена 2 275,8 млн рублёў на датацыі абласцям Беларусі. (Гэта 102,8% да лічбы бягучага года.) Але ёсць шчаслівыя выключэнні. Яўгенія ЛІПНІЦКАЯ, начальнік фінансавага аддзела Дзяржынскага райвыканкама, расказала, адкуль бяруць грошы і як іх трацяць у раёне, які зарабляе сабе на жыццё самастойна.**

### Звесці дэбет з крэдытам

— Асаблівасць бюджэту Дзяржынскага раёна — стварэнне дастаткова ўстойлівай даходнай базы, — расказвае Яўгенія Ліпніцкая. — З аднаго боку, плацельшчыкамі падаткаў з'яўляюцца ўсе нашы прамысловыя прадпрыемствы, з другога — у нас вельмі вялікі недзяржаўны сектар. Нашы даходы і расходы збалансаваны (зарабляем і трацім па 65 млн рублёў). Дапамогу з вобласці мы атрымліваем не ў выглядзе датацый, а субвенцыямі на пэўныя віды выдаткаў, напрыклад на вапнаванне глебы, на іншыя мерапрыемствы, якія рэспубліка ці вобласць фінансуе. Жывём уласнымі даходамі.




Вельмі добрая прамысловая база створана ў Фаніпалі. Асноўным плацельшчыкам падаткаў у раёне з'яўляецца агракамбінат «Дзяржынскі». Яго доля ў даходах 6,5%. Далей ідуць прадпрыемствы рэспубліканскай формы ўласнасці. У рэспубліканскі бюджэт яны плацяць падатак на дабаўленую вартасць і на прыбытак, а астатнія падаткі, у тым ліку падаходны, — у бюджэт раёна. Другім па ўдзельнай вазе плацельшчыкам з'яўляецца РУП «Беларуснафта-Мінскаблнафтапрадукт» у Фаніпалі. Там жа знаходзяцца іншыя буйныя прадпрыемствы, прыбытак ад якіх складае каля 3% раённага бюджэту.

Адзін з «сакрэтаў» развіцця Дзяржынскага раёна — вялікая колькасць прыватных прадпрыемстваў. Здаецца, прычына відавочная — побач сталіца, але магчымасці рэгіёна актыўна развівае і мясцовая ўлада, расказвае наша суразмоўніца:

— Трэба ствараць спрыяльнае асяроддзе для таго, каб прыцягваць бізнес. У нас добрыя транспартныя зносіны. Прадпрымальнік можа асабіста звярнуцца да старшыні раёна з прапановай. Праз аўкцыёны ўчасткі прадаюцца толькі пад гандаль, а пад вытворчасць зямля можа вылучацца і наўпрост. Калі гэта раёну выгадна і ёсць добры бізнес-план, то даём месца для размяшчэння вытворчасці.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

ПАЕХАЛІ!..

## АПАВЯШЧАЛЬНІК БЕЗ БАТАРЭЙКІ і лічыльнік «з жучком»

***Рэйды супрацоўнікаў сельвыканкамаў і інспектараў супрацьпажарнага нагляду МНС звычайна выяўляюць сацыяльныя праблемы***



Старшы інспектар Юрый ДАНІЛЮК з пенсіянеркай Вольгай БАЛАБУШКАЙ.

Святлана ЯСКЕВІЧ

**ПА вёсках Слаўнае, Стасюкі, Вострава старшыня Тэвельскага сельскага Савета Іна КУЗНЯЦОВА накіравалася з інспектарамі нагляду і прафілактыкі Кобрынскага райаддзела МНС Андрэем КРЫЎЦОМ і Юрыем ДАНІЛЮКОМ. Іх мэтай было наведаць адзінокіх грамадзян і тых, якія пражываюць адны. Карэспандэнт «МС» напрасілася з імі ў рэйд.**

### «Жучок» — сваяк пажару

Варта сказаць, што ў 21 населеным пункце сельсавета жывуць 30 адзінокіх грамадзян і 196 тых, хто пражывае адзін. І ўсіх з наступленнем ацяпляльнага сезона трэба наведаць, паглядзець, у якім стане печы, праводка, ці спраўныя аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі, ці няма так званых «жучкоў» у электралічыльніках. Ну і, вядома, выпадае нагода пагаварыць з людзьмі, папытаць, што іх турбуе. Трэба адзначыць, што большасць пажылых пенсіянераў на развітанне казалі нам: «Дзякуй, што зайшлі ў хату, праведалі».

Заўважу, што ў большасці пажылых вяскоўцаў жыллё падрыхтавана да ацяпляльнага сезона як след: печы адрамантаваныя і пафарбаваныя, праводка падтрымліваецца ў належным стане, лічыльнікі нядаўна мянялі. Работа, якая вядзецца гадамі, дае свае вынікі. У некаторых хатах службовым асобам заставалася толькі праверыць, як выконваліся ранейшыя прадпісанні, альбо сапраўды праведаць гаспадароў і ўпэўніцца, што ўсё ў парадку.

Як сказала нам Вольга Балабушка з вёскі Слаўнае: «Толькі п'яніцы, якія кураць у ложку, гараць, а сталыя людзі сочаць за сваім жытлом». З Вольгай Аляксееўнай не пагадзіўся старшы інспектар Юрый Данілюк і напомніў, што пільнасць і клопат пра бяспеку павінны быць ва ўсіх і заўсёды. І хоць значных парушэнняў у гэтай гаспадыні не заўважана, на будучае ёй варта паклапаціцца аб новай праводцы: старыя правады на роліках аджываюць свой век. Свае прапановы супрацоўнік МНС пісьмова выкажа дзецям вясковай жыхаркі.

У іншых хатах выяўлены большыя праблемы. Аказваецца, «жучкі» ў лічыльніках электраэнергіі — гэта не такая ўжо і рэдкасць у XXI стагоддзі. «Жучком» у народзе называюць самаробнае прыстасаванне з дроту, якое ўстанаўліваюць замест засцерагальніка ў прыбор падліку энергіі. Апошні ў выпадку кароткага замыкання ці моцнага перападу напружання спыняе паступленне току, а той самы дроцік, наадварот, яму спрыяе. Вось і лічыце, што «жучок» — найбліжэйшы сваяк пажару. Зусім не чакалі мы знайсці такое крымінальнае прыстасаванне ў доме 78-гадовай Марыі Апанасаўны...

Па дарозе старшыня сельвыканкама расказала прыгожую гісторыю, як сышліся ў адну хату два даволі пажылыя чалавекі, як падтрымліваюць адно аднаго. У дом да Марыі Апанасаўны з суседняй вёскі пераехаў мужчына, але паводле дакументаў яна лічыцца ўсё роўна адзінокай. Калі прыехалі да гаспадыні, то ўбачылі, як цяжка ёй жывецца. Жанчына нядаўна перанесла інсульт і амаль не ходзіць. Каб не яе сябар і памочнік, то самастойна не здолела б нават паесці прыгатаваць.

Печы ў доме аказаліся ў парадку. А вось «жучок» у лічыльнік... нібыта сам запоўз. Мужчына адразу адхрысціўся: маўляў, дом не мой, нічога не ведаю, гаспадыня з двума кійкамі і пагатоў не магла нешта зрабіць з прыборам...

Супрацоўнік МНС Андрэй Крывец зазначыў, што з такой сітуацыяй — калі людзі пачынаюць пераконваць, што яны не ведаюць, хто ўсталяваў забароненыя прыстасаванні, сапсаваў АПА ці яшчэ нейкім чынам нашкодзіў, — сутыкаецца часта. Давесці ім, што гаспадар домаўладання нясе адказнасць за ўсё, што знаходзіцца ў доме і на ўчастку, бывае вельмі няпроста.

Андрэй КРЫВЕЦ прымацоўвае апавяшчальнік у доме адзінокай вясковай жыхаркі.



Пацвярджэнне слоў спецыяліста выратавальнай службы чакала нас у наступнай хаце. Ва Уладзіміра Амельчука не працаваў аўтаномны пажарны апавяшчальнік, які ў пакоі пенсіянера ўстанавілі за сродкі бюджэту. Думалі, што трэба памяняць элемент сілкавання. Але аказалася, што правады, якія вядуць да той самай батарэйкі, акуратна перарэзаны. Гэта значыць, прыбор канчаткова сапсаваны.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

## Уладзімір ПАНЦЮХОЎ: «У ГРАМАДЗЯН ДРОБНЫХ ПРОСЬБАЎ НЕ БЫВАЕ»



**У яго шафе ўсе дакументы скрупулёзна раскладзены па папках: «Еўразійскі эканамічны саюз», «Усебеларускі сход», «Пастаянная камісія» і... «Добрыя справы». У апошняй сабраны звесткі не пра дабрачыннасць, як можа падацца на першы погляд, а пра работу ў рэгіёне. Дакладней, канкрэтныя справы, у якіх атрымалася дапамагчы грамадзянам, што звярнуліся да сенатара. Уладзімір ПАНЦЮХОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі ў пятым і шостым скліканнях, член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па эканамічнай палітыцы, быў вылучаны ад Краснапольскага, Чэрыкаўскага, Касцюковіцкага і Чавускага раёнаў Магілёўскай вобласці. І за чатыры гады работы ў верхняй палаце папка «Добрыя справы» стала поўная.**

«СПЕКТР зваротаў ад людзей не ўкладваецца ні ў адзін рамачны фармат, — дзеліцца сваімі думкамі Уладзімір Панцюхоў. — Часам яны бываюць папросту нечаканымі. На пытанне, чаму звяртаецеся менавіта да мяне, часцей за ўсё адказваюць: «Нам сказалі, што вы можаце дапамагчы і не адмовіце ў гэтым». Таму зваротаў як у пісьмовай, так і ў вуснай форме хапае. Некаторыя нават праз Viber лістуюць, я ўжо не кажу пра электронную пошту... Для мяне важна, каб словы падмацоўваліся справамі: сказаў — зрабі, узяўся — даводзь да канца. Тое, што мяне і ў гэтым скліканні вылучылі ў члены Савета Рэспублікі, — праява даверу і доказ таго, што гэты прынцып працуе».

Уладзімір Панцюхоў паставіў сабе мэту: вырашыць як мінімум адно глабальнае пытанне для кожнага з чатырох давераных яму раёнаў. Як прызнаецца сенатар, самы блізкі для яго — Чавускі. «Хоць люблю, безумоўна, і астатнія не менш», — усміхаецца ён. Але менавіта ў гэтым раёне Уладзімір Іванавіч атрымаў званне «Ганаровага грамадзяніна». «Сёння я працую над тым, каб прыцягнуць сродкі бюджэту Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі для будаўніцтва Чавускай лыжаролернай трасы. Некалькі гадоў таму яно распачалося, але з прычыны слабага папаўнення раённага і абласнога бюджэтаў і немагчымасці далейшага фінансавання зараз гэты аб'ект замарожаны. Але традыцыі біятлону ў гэтым і Чэрыкаўскім раёнах дужа моцныя. Адтуль пайшлі прызёры чэмпіянатаў свету і алімпіяд у гэтым відзе спорту. У мясцовай школе-інтэрнаце шмат дзяцей, якія займаюцца хакеем, цяжкай атлетыкай і біятлонам, уваходзяць у склад зборных нашай рэспублікі», — кажа сенатар. Будаўніцтва адпаведнага спартыўнага комплексу дазволіла б праводзіць не толькі абласныя і рэспубліканскія спаборніцтвы, але і міжнародныя.

У Чэрыкаўскім раёне надзённае, набалелае пытанне — будаўніцтва лазнева-аздараўленчага комплексу. Лазня ўжо ёсць, але за гады існавання яна страціла першапачатковы выгляд і мае вялікую колькасць праблем. У Касцюковіцкім раёне работа вядзецца над тым, каб збудаваць нармальны морг. На жаль, той, што існуе, не адпавядае нормам. «Мы павінны з павагай ставіцца да тых, хто пайшоў з жыцця, — перакананы парламентарый. — І пытанне аб такога кшталту будаўніцтве стаіць нароўні з узвядзеннем спартыўна-забаўляльных устаноў». Як, напрыклад, будаўніцтва другой чаргі аздараўленчага цэнтра з басейнам у Краснаполлі, горадзе, які пацярпеў ад чарнобыльскай катастрофы больш за ўсе навакольныя раённыя гарады. Да гэтага раёна ў сенатара асаблівa цёплае стаўленне. «Калі прыязджаю да іх, стараюся падчас асабістых сустрэч прачытаць тое, што б іх кранула, развесяліла, узбадзёрыла. І краснапольцы адказваюць узаемнасцю: заўжды чакаюць у госці», — кажа ён.

Усе чатыры раёны адносяцца да так званых «чарнобыльскіх». Таму ўсе структуры, і асабліва ўлады, працуюць над тым, каб жыццё там было максімальна камфортным. «Але наша задача — не толькі падтрымаць тых, хто жыве ў гэтых раёнах, але і прывабіць у іх новых жыхароў. Няхай гэта будзе малады беларус, які прыедзе і будзе ўпэўнены, што яго чакаюць дастойнае месца працы, магчымасць атрымаць добрае жыллё для сваёй сям'і. Такім чынам мы не толькі падтрымаем існуючае, але і дадзім новае дыханне рэгіёну», — лічыць ён.

> **«** Для выбаршчыка сапраўды важнае пытанне — тое, што адбываецца побач з ім: чысціня на вуліцы, гарачая вада, своечасова выплачаная зарплата.

У Савеце Рэспублікі за сенатарам замацоўваюць пэўны рэгіён. Для Уладзіміра Панцюхова — гэта Магілёўская і Гродзенская вобласці. Таму звяртаюцца да сенатара і адтуль. Просьбы ў грамадзян самага рознага кшталту: замяніць ацяпляльны комплекс, дапамагчы з размеркаваннем пасля заканчэння ВНУ, дабудаваць культурна-аздараўленчы цэнтр (гэта тычыцца Касцюковіцкага раёна). Апошняе зараз здзяйсняецца, і, магчыма, ужо хутка мы зможам быць на яго адкрыцці. «Неаднаразова да мяне звярталіся Саветы ветэранаў. Гэтым разам ветэраны з Чавус папрасілі дапамагчы набыць стол для настольнага тэніса», — дзеліцца парламентарый.

АЛЕ асноўная праца Уладзіміра Панцюхова як сенатара і старшыні камісіі — заканатворчая. «Людзям не вельмі цікава тое, чым мы займаемся ў асноўным, — законы. Для выбаршчыка сапраўды важнае пытанне — тое, што адбываецца побач з ім: чысціня на вуліцы, гарачая вада, своечасова выплачаная зарплата. І калі ў параўнанні з глабальным гэта падаецца дробяззю, то для чалавека — якраз наадварот. Яго пытанне — самае актуальнае. Задача сенатара не ў тым, каб разважаць наконт гэтага, ён павінен перш за ўсё дапамагчы чалавеку вырашыць яго праблему як мага хутчэй».

Уладзіміра Панцюхова ў найбліжэйшы час чакае праца не толькі з грамадзянамі, але і ў пастаянных камісіях Савета Рэспублікі, краін СНД і Саюзнай дзяржавы: «З мінулым складам камісіі Савета Рэспублікі развітваўся са слязьмі на вачах. За чатыры гады работы мы сталі адно аднаму амаль як родныя. Што тычыцца новых членаў нашай камісіі, то гэта прафесіяналы сваёй справы, выдатныя кіраўнікі, якія, перакананы, змогуць зрабіць свой унёсак у заканатворчы працэс».

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

САМІ ДЛЯ СЯБЕ

## ДЗІЦЯЧАЯ ПЛЯЦОЎКА як альтэрнатыва клубу

***У Шклоўскім раёне ініцыятыву ў свае рукі ўзялі жыхары***



Гэту альтанку ўпрыгожвала Ірына БАРЫСАВА.

**Калісьці на тэрыторыі Каменналаўскага сельсавета існаваў калгас «Зара». Гаспадаркі ўжо няма, але зямля па-ранейшаму дагледжана, на фермах гадуецца жывёла, з пастаўкамі мяса і малака праблем ніякіх. Ды і вёскі не выглядаюць кінутымі. Наадварот. Дзяцей столькі, што жыхары выходзяць самастойна будаваць гульнявыя пляцоўкі для іх. І робяць гэта з добрым настроем і крэатывам. У вёсцы Вялікая Камароўка такую пляцоўку адбудавалі, што нават дэпутат з Чавускага раёна пазайздросціў. Па-добраму, вядома ж. Нават у наш карпункт патэлефанаваў, каб карэспандэнт абавязкова наведала яе і ўсім расказала.**

Канулы ў лету калгас «Зара» з поспехам замяняюць фермеры. Вёску Новыя Комсінічы апякае Аляксандр Канавалаў, Новую Вадву — Аляксандр Уласік, Старую Вадву — бацька з сынам Аляксандр і Сяргей Казначэевы, Цвыркава — Віктар Дунаеў.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

АБМЯРКУЕМ!

## ЦІ БЫЦЬ ХРАМУ?

***Каму перашкаджае яшчэ не ўзведзеная святыня***

Аляксандр ПУКШАНСКІ

**У Віцебску, як кажуць, тэмай №1 для «абмеркавання на кухнях» стала перспектыва ўзвядзення праваслаўнага храма ў парку па вуліцы Чэхава. Там задумалі пабудаваць копію знакамітай полацкай Сафіі — такой, якой яна была першапачаткова. Але нямала гараджан супраць. Лісты са скаргамі накіроўваюцца ў гарвыканкам і вышэй. У інтэрнэце тысячы людзей выказалі незадаволенасць. У чым сутнасць праблемы і як яна вырашаецца? Гэта высвятляў карэспандэнт «МС».**

### *У ціхім парку...*

Некалькі гадоў таму кіраўнікі мясцовай улады агучылі ідэю вернікаў, якая адразу стала абмяркоўвацца: бераг Заходняй Дзвіны можа ўпрыгожыць копія Сафійскага сабора. Падкрэслівалася, што на храм бюджэтныя грошы выкарыстоўвацца не будуць...

Сафійскі сабор у Полацку быў пабудаваны ў XI стагоддзі. І ён стаў трэцяй Сафіяй. У Кіеве Сафійскі храм быў закладзены ў 1037 годзе, у Ноўгарадзе — прыблізна ў 1045-м. Полацкі разбурылі ў 1710 годзе, а ў сярэдзіне XVIII стагоддзя аднавілі.

На думку аўтараў ідэі будаўніцтва ў Віцебску, храм стане сімвалам братэрства ўкраінскага, рускага і беларускага народаў. Безумоўна, у іх агульныя гістарычныя карані, яднае і хрысціянская вера. У наш час тром народам, як ніколі раней, патрэбна ўзаемаразуменне.

Блаславіў будаўніцтва і Свяцейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі — прадстаяцель РПЦ. Адпаведныя словы ёсць на пашпарце аб'екта — на агароджы будаўнічай пляцоўкі.

**Настаяцель будучага храма айцец Міхаіл** не раз нагадваў храналогію падзей. Адпаведная інфармацыя ёсць на сайце Віцебскай епархіі. У год 2000-годдзя ад Раства Хрыстова прынялі рашэнне аб будаўніцтве храма. Ініцыятары былі ўпэўненыя, што храм упішацца ў комплекс гістарычнай забудовы. Побач — помнікі архітэктуры, пешаходная зона...



Так, мяркуецца, будзе выглядаць храм.



Падчас абмеркавання прадстаўнікі ўлады сустрэліся з незадаволенымі.

Святы Сінод Беларускай праваслаўнай царквы ўхваліў узвядзенне сабора. Рашэнне зацвердзіў і Святы Сінод Рускай праваслаўнай царквы пад старшынствам Патрыярха Кірыла...

Наконт таго, чаму выбралі месца пад будаўніцтва менавіта ў ціхім парку. Як сцвярджаюць афіцыйныя асобы гарвыканкама, разглядалася некалькі варыянтаў. У прыватнасці, каля плошчы Перамогі, побач з будынкамі дарэвалюцыйных саляных складоў... Але ідэальным вызначылі парк Партызанскай славы... Вылучэнне менавіта гэтага ўчастка для будаўніцтва ўзгаднілі з усімі неабходнымі інстанцыямі.

### *«За» і «супраць»*

Журналіст пабываў на сустрэчы прадстаўнікоў гарвыканкама з незадаволенымі. Гутарылі каля будаўнічага вагончыка. Але нармальнага дыялогу не атрымалася.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*